Свою эффективность доказала и такая форма воспитательной работы с иностранными студентами, как литературная гостиная. Посредством такого рода речевой практики расширяется литературное образование обучающихся, формируются эстетические механизмы общения с художественным словом, развивается духовно-нравственная сфера личности студентов.

Литературная гостиная предполагает свободное общение на литературном материале, участие в «живом диалоге». В этом году в литературной гостиной участники представили свои любимые книги и прочитали отрывки из них, причем прозвучали произведения как русских писателей и поэтов XIX—XX веков, так и стихи национальных авторов на русском языке.

Неповторимую атмосферу душевности и увлеченности удалось создать не только благодаря эмоциональному выразительному исполнению литературных произведений, но и прозвучавшим музыкальным произведениям русских композиторов. Творчество, эмоциональный подъем, юмор, театрализация, аплодисменты зрителей сделали это мероприятие незабываемым.

Также популярны среди иностранных студентов различные экскурсии, путешествия, знакомящие с историей и традициями страны, в том числе и Брестской области. Такие поездки способствуют расширению кругозора студентов, формируют устойчивый интерес к изучению русского языка. Традиционны посещения замковых комплексов в Мире и Несвиже, Брестской крепости, музеев и театров Минска.

Интересны студентам и заочные экскурсии, которые они совершают на факультативных занятиях по лингвострановедению. Просмотр документальных фильмов об объектах культурного и материального наследия стран изучаемого языка дополняет работу с текстом, позволяет, не выходя из аудитории, увидеть культурные достопримечательности, поделиться впечатлениями об увиденном.

В рамках дисциплины «Русский язык как иностранный» студенты посещают курсы и факультативы по выбору «Деловой иностранный язык», «Лингвострановедение», которые расширяют и углубляют приобретенные нами знания по обязательным дисциплинам. На этих занятиях предметом общения становятся материально-технические, нравственно-этические, культурно-исторические вопросы. Общение на русском языке приобретает активную форму, что способствует совершенствованию коммуникативных навыков.

В нашем университете иностранные студенты активно занимаются научно-исследовательской деятельностью, результатом которой становится участие в конференциях разного уровня. Студенты получают возможность проявить личностные качества, добиться определенного успеха в преодолении языкового барьера. Участие в научно-исследовательской работе дает мощную мотивацию для развития интеллектуальных и творческих способностей.

**Заключение.** Внеаудиторная деятельность по русскому языку как иностранному, осуществляемая в БарГУ, способствует развитию у студентов коммуникации, творческого потенциала, способности самореализации, углубляет и расширяет языковую компетентность, культурологический кругозор, развивают творческую активность.

**Список цитируемых источников**

1. *Луговцова, Е. И.* Формирование у учащихся умения жить в поликультурном мире : пособие для пед. работников общеобразоват. учреждений / Е. И. Луговцова. — Минск : Нац. ин-т образования, 2010. — 191 с.
2. *Минова, М. Е.* Формирование нравственных ценностей учащихся в детских и молодежных объединениях : пособие для рук. учреждений образования, педагогов-организаторов, кл. руководителей, работников учреждений внешк. воспитания и обучения / М. Е. Минова. — Минск : Нац. ин-т образования, 2009. — 152 с.

УДК 372.882

**Т. Л. Харытонава**
*Джяржаўная ўстанова адукацыі «Ляснянская сярэдняя школа Баранавіцкага раёна»*

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ КРАЯЗНАЎЧАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Галоўная мэта навучання прадмету «Беларуская літаратура» — далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа. Таму зварот да краязнаўчага матэрыялу, да вывучэння роднага краю, яго літаратурных старонак адыгрывае значную ролю пры фарміраванні ў вучняў сістэмы эмацыянальна-каштоўнасных адносін, у набыцці імі вопыту літаратурна-творчай дзейнасці.

Сёння многіх настаўнікаў непакоіць тое, што сярод значнай часткі моладзі пашырыліся кепскі густ, вузкасць духоўных інтарэсаў, недастатковае валоданне культурнай спадчынай. Па выніках праведзенага даследавання ў 8—11 класах ДУА «Ляснянская сярэдняя школа Баранавіцкага района» з мэтай маніторынга адносін навучэнцаў да гуманістычных каштоўнасцей патрыятызм размясціўся на 6 месцы ў 10 класе, на 8 —

© Харытонава Т. Л., 2019

Репозиторий БарГУ

у 8 класе, на 9 — у 9 класе, на 10 — у 11 класе пасля такіх каштоўнасцей як справядлівасць, шчасце, свабода, дабро, міралюбнасць, годнасць і сумленне, сяброўства, міласэрнасць, вера і ідэалы.

Нельга выхоўваць пачуццё патрыятызму без звароту да сваіх каранёў. Шырокія магчымасці ў фарміраванні маральных ідэалаў вучняў закладзены ў літаратурна-краязнаўчай рабоце. Знаёмства з узорамі мясцовага фальклору, з жыццёвым і творчым шляхам пісьменнікаў-землякоў, з помнікамі і традыцыямі культурнага жыцця роднага краю, з гераічным мінулым паглыбляе літаратурныя веды, прымушае параўноўваць мінулае з сучасным, выхоўвае гонар за свой край і сваіх землякоў. Гэта вядзе, з аднаго боку, да правільнага ўспрымання літаратурных твораў, з другога, — да паглыблення ўсведамлення навакольнай рэчаіснасці.

Урок літаратуры часам страчвае галоўнае, без чаго не можа быць не толькі багацця ўнутраных адчуванняў вучняў, але і глыбокіх ведаў. Для таго, каб ведаць літаратуру, яе трэба адчуць і перажыць. Звычайна настаўніку ад вучня ў першую чаргу неабходна пачуць суму літаратурных звестак па праграме, а ўнутраны свет вучня для яго застаецца нераскрытым. Зварот да краязнаўчага матэрыялу дазваляе выклікаць імкненне вучняў назіраць і асэнсоўваць жыццё, думаць, разважаць, супастаўляць, самім выпрацоўваць правільныя перакананні, скіроўвае вучняў да творчай працы, развівае творчую думку, творчы падыход да той ці іншай літаратурнай ці жыццёвай з'явы. Знаёмства з літаратурным жыццём роднага краю забяспечвае ўзаемасувязь жыццёвых і літаратурных уражанняў, вядзе да ўзмацнення працэсу пазнання як літаратурнага твора, так і рэчаіснасці.

Баранавіччына мае цікавае гістарычнае мінулае, багатую самабытную культуру, таленавітых і мужных людзей. Гэта цэлая кагорта вялікіх постацяў: Андрэй Рымша, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Паўлюк Багрым, Уладзіслаў Галубок, Алесь Гарун, Канстанцыя Буйло, Валянцін Таўлай, Сяргей Новік-Пяюн і інш. Пэўнае месца ў гісторыі краю займаюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны (Калдычэўскі лагер смерці, Лясянскі лагер для савецкіх ваеннапалонных — шталаг-337, вёска Застарынне, спаленая з мірнымі жыхарамі). Вывучаючы беларускую літаратуру, немагчыма не звярнуць ўвагу вучняў на ўсе гэтыя шматлікія факты.

Літаратурнае краязнаўства адыгрывае немалаважную ролю ў фарміраванні цікавасці вучняў да аўтара мастацкага твора. Аповед пра сувязь пісьменніка з родным краем вучняў набліжае асобу пісьменніка да чытача, робіць яго вобраз канкрэтна ўяўляемым, а ўспрыняцце звестак пра яго жыццё і творчасць — больш эмацыянальным.

На станцыі Лясная Баранавіцкага раёна ў 1882 годзе нарадзіўся прадстаўнік беларускага Адраджэння Уладзіслаў Галубок. Акцёр і рэжысёр, жывапісец і пісьменнік, грамадскі дзеяч і арганізатар тэатра, унук паўстанца, які стаў пад сцягі Кастуся Каліноўскага і змагаўся пад Мілавідамі — усё гэта і многа яшчэ чаго можна сказаць пра гэтага чалавека. Асобныя гадзіны на вывучэнне жыцця і творчасці гэтага пісьменніка ў школьнай праграме не выдзяляюцца. Але пры вывучэнні вучнямі Лясняскай сярэдняй школы ў 9 класе аглядавай тэмы "Беларуская літаратура ў пачатку XX стагоддзя" больш увагі неабходна аддаць пісьменніку-земляку. Урок будзе больш эмацыянальным, калі яго правесці каля памятнага знака Уладзіславу Галубку, устаноўленаму ў аграгарадку Лясная.

Пры асэнсаванні ў аглядавых тэмах творчасці асобных пісьменнікаў перспектыва выкарыстання краязнаўчага матэрыялу павялічваецца. Настаўнік тут мае права выбару і можа больш поўна паказаць жыццё і творчасць пісьменніка-земляка. Менавіта мясцовыя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца на такіх уроках, садзейнічаюць больш глыбокаму ўсведамленню асаблівасцей развіцця беларускай літаратуры пэўнага перыяду. Так, напрыклад, разглядаючы ў 9 класе тэму «Станаўленне новай беларускай літаратуры ў пачатку XIX стагоддзя» настаўнікам школ Баранавіцкай зямлі больш увагі можна аддаць постаці Яна Чачота, назвы балад якога «Мышанка», «Калдычэўскі шчупак», «Узногі» перадаюць тапаніміку Баранавіцкага раёна. Напісаны яны паводле мясцовых паданняў.

Аснову літаратурнай адукацыі складаюць мастацкія творы. Пры вывучэнні мастацкага твора абавязкова патрэбна суадносіць яго змест з тымі гістарычнымі падзеямі, якія ўсхвалявалі пісьменніка і сталі прадметам яго асэнсавання. Вучняў больш уражвае тое, што ім блізка, што звязана з роднымі мясцінамі. «Твор, "упісаны" ў падзеі, якія адбываліся на яго радзіме, успрымаецца больш эмацыянальна, больш асабова» [1, с. 117]. На гэтым заснаваны зварот да краязнаўчых матэрыялаў, аналагічных тым, якія асэнсаваны ў вывучаемым творы.

У школьнай праграме змешчана шмат твораў ваеннай тэматыкі. Тэма Вялікай Айчыннай вайны асвятляецца ў творчасці П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, Я. Брыля, В. Зуёнка, Е. Лось, В. Быкава, І. Навуменкі, Р. Барадуліна. Пры вывучэнні гэтых твораў вучнямі Лясянскай школы абавязкова трэба звяртацца да гераічнай гісторыі родных мясцін.

У першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай ворагамі тэрыторыі ў раёне Баранавіч быў створаны фашыстамі лагер для савецкіх ваеннапалонных — шталаг-337. Лагер «Лясны» знаходзіўся прыкладна за тры кіламетры ад чыгуначнай станцыі Лясная, злева ад шашы Баранавічы — Слонім, і прымыкаў да прасёлачнай дарогі Бярозаўка — Лясная. Страшэнныя сляды пакінуў гэты лагер на нашай зямлі. З акта Баранавіцкай гарадской камісіі па расследаванні злачынстваў гітлераўцаў: *«Па шашы Баранавічы — Слонім у 250 метрах ад турмы г. Баранавічы выяўлена 21 магіла розных памераў (...). У вышэй названых ямах-магілах пахавана 31 тыс. савецкіх ваеннапалонных, якія былі ў баранавіцкай цэнтральнай турме. Па шашы Баранавічы — Слонім у 22 км ад Баранавіч у радыўсе лагера ваеннапалонных № 337 да 5 км знойдзена 60 магіл розных памераў (...). Тут пахавана 50 тыс. чалавек, з якіх 44 тыс. ваеннапалонных ва ўзросце ад 20 да 45 гадоў і 6 тыс. мірных жыхароў».* Дзясяткі магіл, дзясяткі тысяч пахаваных у іх… Загінуўшых, але не зламаных,



Репозиторий БарГУ

да апошняга свайго дня не прыпыняючых барацьбу з ворагам. Ім, загінуўшым у барацьбе з ворагам, у пасляваенныя гады былі пастаўлены помнікі на тэрыторыі Баранавіцкага раёна.

Звяртаючыся да гэтых матэрыялаў, вучні не толькі пашыраюць веды пра час, які адлюстроўваецца ў мастацкіх творах, не толькі бачаць трагічна-гераічную гісторыю роднага краю, але і адчуваюць сваю далучанасць да гэтых падзей. Гэта актывізуе іх пазнавальную дзейнасць і стымулюе да пошукавай і даследчай працы.

Патрабаванні сучаснага жыцця, дзяржавы, грамадства да школьнай адукацыі і яго вынікаў пабуджаюць выкарыстоўваць розныя формы працы, накіраваныя на забеспячэнне сацыяльнага, каштоўнаснага і пазнавальнага развіцця асобы, на падрыхтоўку навучэнцаў да выканання грамадзянскіх абавязкаў у будучым дарослым жыцці.

Звяртацца да літаратурнага краязнаўства мэтазгодна пры выкарыстанні адукацыйнага патэнцыялу вітагеннага навучання з улікам таго, што аснову вітагеннага навучання складае жыццёвы вопыт, атрыманы асобай з розных магчымых крыніц, пачынаючы з навакольнага сацыяльна-эканамічнага, культурна-этнаграфічнага асяроддзя і завяршаючы сродкамі масавай інфармацыі і адносінамі ў сям'і.

Вітагеннае навучанне прапануе навучэнцам вітагенную (жыццёва значную і жыццёва важную) інфармацыю. Засваенне навучэнцамі вітагеннай вучэбнай інфармацыі (у дадзеным выпадку краязнаўчай) будзе дадатковым механізмам развіцця якасцей асобы чалавека-грамадзяніна.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Ляшук, В. Я.* Літаратурнае краязнаўства ў школе / В. Я. Ляшук. — Мінск : Выш. шк., 1991. — 150 с.

УДК 821.161.1: 82-32

**А. С. Цоник, С. А. Карташова**
*Государственное учреждение образования «Гимназия № 1 г. Барановичи», Барановичи*

## КОНЦЕПЦИЯ ЧЕЛОВЕКА В РАССКАЗЕ К. САЙМАКА «КОГДА В ДОМЕ ОДИНОКО»

**Введение.** Люди всегда стремились определить, что есть добро, а что — зло. И наука здесь зачастую оказывалась в тупике. Тогда приоритет переходил к искусству и литературе. Исследуя и познавая человека в природе и обществе, они обращают свой взгляд все дальше и глубже — в Космос, Вселенную. Весомую лепту в уточнение границ этих вечных вопросов и ответов внесла и вносит фантастика.

Писатели-фантасты создали воображаемый мир. Они отвечают на вопрос: что ожидает человека в необъятных просторах земного и звездного мира? Научная фантастика давно завоевала уважение и любовь миллионов людей, доказав, что ей по плечу самые большие задачи, что она — самая что ни есть большая литература. А возможности ее в раскрытии «космоса человеческой души» поистине безграничны.

Существует мнение, что в 60-е годы 20-го века человечество, стремясь в космос, тем самым готовило себя к встрече с внеземными цивилизациями; сегодня, в начале 21-го века, писатели-фантасты не так оптимистичны: все больше звучат предостережения-опасения по поводу таких контактов. Одним из таких писателей является американский фантаст Клиффорд Доналд Саймак, который в своем творчестве пытается раскрыть собственное понимание концепции человека.

Концепция — это система взглядов, связанных между собой и вытекающих один из другого.

Сущность человека в том, что он обладает разумом. Человек — высокоразвитое существо. «Я-концепция» — система представлений индивида о самом себе, которые в большей или меньшей степени им осознаны и зафиксированы в словесной форме. Эта концепция — результат познания и оценки самого себя в условиях самых разнообразных реальных и фантастических ситуаций, а также через мнения других людей и соотнесения себя с другими.

**Основная часть.** Клиффорд Доналд Саймак родился в 1904 году в штате Висконсин (не случайно именно там происходит действие многих его произведений). Первый свой научно-фантастический рассказ Саймак напечатал в 1931 году. Признание пришло к нему позже — в конце 30-х годов, когда он начал печататься в журнале «Эстаундинг», редактором которого был Джон Кэмпбелл. Вместе с Азимовым, Ван Вогтом, Дель Реем, которые печатались в журнале, Саймак считался отцом современной американской научной фантастики, а благодаря этим писателям с конца 30-х до второй половины 40-х годов по праву называют «золотым веком» фантастики США.

Широкую известность принес Саймаку роман «Город» (1952) [1], с которого начинается расцвет творчества писателя. Свыше тридцати романов, сборников повестей и рассказов, многочисленные литературные премии, в том числе и самая престижная в американской фантастике премия «Хьюго», лауреатом которой

© Цоник А. С., Карташова С. А., 2019



Репозиторий БарГУ